# ХРЫСЦІЯНСКІЯ МАТЫВЫ У ТВОРЧАСЦІ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

## (Выступленне на юбілейнай канферэнцыі ў Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь 9 снежня 1991 года)

Максіма Багдановіча можна па праву лічыць самым хрысціянскім па духу пісьменнікам Беларусі. Творы ягоныя - духоўныя, і не толькі таму, што яны прасякнутыя міласэрнасцю, ахвярнай любоўю да чалавека і роднага краю, тонкім адчуваннем прыгажосці. Вядома, тут, як і ўва многіх, і туга, і хвароба, і адзіноцтва, - але над усім - любоў, тая што забываецца на сябе і цярпліва нясе крыж свой і народа свайго.

У вершах паэта няма эгаістычнай сканцэнтраванасці толькі на сабе, імкнення паказаць выключна ўласныя "высокія думкі і пачуцці"; няма ў іх і заклікаў "да бунту і помсты". Ёсць боль, гарачае спачуванне і нейкая незвычайная лагоднасць сэрца. Няма "паэтычнай эротыкі" і бурлівых страсцей: інтымная лірыка надзвычай светлая, напоўненая чысцінёй, сціпласцю - тымі дабротамі, што так высока ставяцца ў хрысціянстве. Найбольш яскрава гэтая цысціня сэрца выявілася ў разуменні паэтам прыгажосці, жаночай цнатлівасці.

Творы Багдановіча нібыта прасякнутыя светам евангельскіх запаведзяў. Хрыстос для паэта - не тэма паэтычных уздыханняў ці касмічных імкненняў, а само жыццё, крыніца яго, аснова адносін да навакольнага. Пры вельмі зямной рэальнасці сюжэтаў, тэм і пачуццяў, творы ягоныя заўсёды высокія сваёй духоўнасцю.

Біяграфія і ўспаміны пра Багдановіча, напісаныя ў савецкі перыяд, вядома, не адлюстроўваюць рэлігійных аспектаў ягонага выхавання і светапогляду - такіх нібыта і не было. Але з твораў паэта высвечваюць моманты яго дзіцячага жыцця, што грунтаваліся на хрысціянскіх традыцыях. Гэта апавяданне "Катыш", дзе так добра паказана радасць чакання Уваскрэсення ў пачуццях маленькага хлопчыка, які атрымаў цудоўнае яечка-катыш; хваляванні дзіцяці у час катання яек. Або пачуцці героя апавядання "Чудо маленького Петрика", які, засынаючы, глядзіць на свет лампады перад абразамі.

Найбольш выразна дзіцячыя рэлігійныя ўражанні адлюстраваліся ў апавяданні "Колька": з вялікай псіхалагічнай дакладнасцю перададзены ў ім светлы, узнёслы стан дзіцячай душы пад час прычашчэння Святых Дароў - Цела і Крыві Хрыстовых. Кольке трэці год, ён калека, вельмі хворы, змучаны... І як жа светла, як радасна прымае ягоная душа Хрыста, як імкнецца ўгару, пад блакітны купал царквы, у святло веч-

насці!.. Так напісаць можна толькі захаваўшы на ўсё жыццё рэальныя жывыя ўспаміны дзяцінства. Такого яскравага, шчырага апісання Святого Прычасця, мусіць, болей ні ў кога няма.

Дзіцячае ўспрыяцце, вядома, залежыла ад маці, яе выхавання. Маці паэта Марыя Апанасаўна паходзіла з рэлігійнай сям'і з роду праваслаўных святароў. Яна была міласэрная, вельмі чулая да праўды і справядлівасці. Аб яе рэлігійнасці сведчыць напісанае ёю традыцыйнае калядное апавяданне "Накануне Рождества" і асабліва - яе апошняе слова перад смерцю: "Свяшчэнніка!..". Спавядаюць, прычасціць яе не паспелі, але душа жанчыны ўжо была на шляху да Хрыста.

Маці памёрла рана - Максіму было пяць год. Гэта той узрост, калі ўжо склаўся характар, былі закладзеныя асновы адносін да навакольных. Хрысціянскія паводзіны маці, яе малітва, навучэнне, безумоўна, мелі багаты ўплыў на сына. Далей Максім ужо сам вывучаў у гімназіі і ліцэі Закон Божы, славянскую і грэцкую мовы, Свяшчэннае Пісанне, як і ўсе вучні; жыў у рэчышчы агульных хрысціянскіх традыцый свайго часу.

З успамінаў вядома, што студэнтам ён чытаў чэшскі і сербскі пераклад Евангелля, да таго ж добра ведаў славянскі і рускі тэксты. Выкарыстанне паэтам евангельскіх перакладаў у мэтах вывучэння мовы гаворыць аб разуменні ім таго, што менавіта евангельскі тэкст дае магчымасць выявіць багацце, моц, узнёсласць і прыгажосць той ці іншай мовы, а славянскі пераклад, як сведчаць і сучасныя славісты свету, найбольш адпавядае па сваёй духаноснасці грэцкаму арыгіналу.

Творы Багдановіча сведчаць аб веданні ім Свяшчэннага Пісання, хрысціянскіх апокрыфаў, гісторыі Царквы; аб сапраўдным разуменні хрысціянскай архітэктуры і іконапісу. Тут, пэўна, меў значэнне эстэтычны ўплыў скарбаў царкоўнай архітэктуры і жывапісу, што меліся у Яраслаўлі. Душа Максіма з дзяцінства вельмі чула ўспрымала прыгажосць прыроды і твораў боганатхнёнага чалавечага таленту.

У біяграфіі Багдановича ёсць адзін, на мой погляд, сімвалічны момант: падлеткам, у 11-12 год Максім паставіў мэтаю змясціці малітву "Ойча наш" у адзін радок. Працаваў доўга, старанна; змясціў - і вельмі радаваўся з гэтага. Здавалася б, дзіцячая прыдумка, але ж аб'ектам першых літаратурных вопытаў стала малітва Гасподняя. Дзеля гэтага трэба было ўспрымаць яе як нешта самае важнае і каштоўнае, бо падлетак не шукаў незвычайнай формы дзеля нечага звычайнага, як гэта робіцца ў асяроддзі фармалістаў, а наадварот, узяўшы Вялікае, прыступіў да яго, каб змясціць у сваім маленькім дзіцячым сэрцы. Есць у гэтым нешта прарочае, бо ці ж не была творчасць Багдановіча спрасаванай у адзін паэтычны радок малітвай за Айчыну?

Максім Багдановіч не быў тым містычным паэтам, якіх шмат існавала ў пачатку стагоддзя, яле ягоная рэалістычная, зямная паэзія значна бліжэй па духу да евангельскіх запаветаў, чым самыя вытанчаныя містычныя вершы.

Хрысціянская тэматыка займае значнае месца ў спадчыне Багдановіча. Цудоўныя творы, сюжэты і стыль якіх натхнёныя біблейскімі тэкстамі, хрысціянскімі апокрыфамі: апавяданне "Апокрыф" (або "Притча о васильках"), паэма "Страцім-лебедзь", верш "Кніга", верш-апокрыф "Упалі з грудзей Пана Бога", пераклады "На реке Вавилонской", "Юдава поле", мініяцюра у прозе "Калейдоскоп жизни". Гэтыя вершы перадаюць душэўны стан хрысціяніна, унутра-

наю асабістую барацьбу чалавека з навалами зла - "Цемень", "Кніга"; жывапісныя жыццёвыя замалёўкі, што звязаныя з хрысціянскімі традыцыямі - верш "Перапісчык", апавяданні "Катыш", "Колька", "Чудо маленького Петрика"; творы, напісанныя пад уражаннем ад манастыроў, храмаў, рэлігійнага жывапісу - верш "Костел святой Анны", апавяданні "Феадосія", "Старый Крым", "Мадонна"; цудоўная гістарычная стылізацыя "Апавяданне аб іконніку і залатару...". Нарэшце, артыкул на гістарычную тэму "Белорусское возрождение", у якім ідзе гаворка аб праваслаўных брацтвах, што былі апораю беларускага народу. Разгледзім асноўныя з іх у аспекце хрысціянскай тэматыкі:

Светлым малітоўным настроем прасякнуты верш "Кніга". У ім гучыць цудоўны радок з псальмы цара Давіда і водгук сэрца самога паэта:

*"Вось псальма слічная: як той алень шукае*
*Крыніцы чыстай, так шукаю Бога я.*
*Як вее свежасцю яе краса жывая!*
*Як радасна ўсё дальш спяшыць душа мая!".*

Менавіта так чуецца сэрца верніка ад чытання псальПсальмаў, Евангелля - радаснае імкненне да Бога, да жыцця вечнага, што пачынаецца на зямлі, у душы кожнага чалавека. І Душа гэтая, як жывую ваду, піе з крыніцы слова Божага. Па адпаведнасці перадачы настрою ад псальмаў, паэтычнасці і ўзнёсласці верш Багдановіча пераклікаецца з цудоўным перакладам на рускую мову "Шестопсалмия", што зрабіў у наш час Сяргей Аверынцаў. Як стогн душы гучыць верш Багдановіча "Цемень":

*"Над зямлёю - імгла, у душы маёй змрок.*
*О, як пуста ў ёй! О, як холадна жыць!*
*Але вось цераз цемень маланка бліщчыць,*
*Асвячае мне вобраз Хрыста... Яго Крыж...*
*Ажываем, здаецца, душою гарым.*
*Але толькі чаму ж так малы гэты час?!*
*Зноў навокала цемень. Свет зірнуў і пагас.*
*Не глядзіць на мяне светлы вобраз Хрыста,*
*Над зямлёю імгла, у душы пустата".*

У вершы - праўда рэлігійнага пачуцця, калі душа тоне ў бездані адчаю, маловер'я і раптапм адчувае выратавальны прамень Святла Хрыстовага, хаця б на імгненне. Не здарма існуе шмат хрысціянскіх малітваў, каб абараніцца ад гэтага стану, і перш за ўсё - евангельскае "*Верую, Господзе! дапамажы майму няверʼю*" (Мр. 9, 23); старажытная малітва Яфрэма Сірына, што гучыць у Вялікі Пост ва ўсіх цэрквах.

...Адчай, туга. Паэт вельмі дакладна перадае стан хрысціянскай душы, якае заўсёды ў змаганні са злом: падае, устае. Усё жыццё - як барацьба святла і цемры: "Бог борется с сатаною, а поле битвы - сердце человека", - сказаў Ф.Дастаеўскі.

Верш "Жывеш не вечна, чалавек" далёкі ад рэлігійнай тэматыкі, але ж у простым ягоным радку - "Жыві і цэльнасці шукай, аб высаце духоўнай дбай" - водгук хрысціянскага багаслоўскага разумення сутнасці чалавека, як цэласнага трыадзінства - духа, душы і цела; і духоўнасць - як мэта жыцця ("стяжание Духа Святаго", па прападобнаму Серафіму Лароўскаму).

Багдановіч, напэўна, не думаў аб багаслоўскім аспекце: у ім проста жыло хрысціянскае разуменне сутнасці чалавека, ягонага высокага прызначэння. Шмат можна сказаць аб тым, як цудоўна перадаюць апакрыфічныя творы Багдановіча водар усходне-хрысціянскіх апокрыфаў І-ІІ стагоддзяў, іх чысціню і наіўнасць; з якім вялікім густам выкарыстоўвае паэт хараство, цудоўную прастату і мастацкія якасці стылю евангельскіх тэкстаў. Чытаеш ягоны "Апокрыф" (рускі варыянт - "Притча о васильках"), і ў душу ліецца

мірнасць, святло - тая прыгажосць, што стагоддзямі завецца Святлом Евангельскім. І "Апокрыф", і "Музыка" - творы надзвычай высокай паэтычнасці і духоўнай прасветленасці. Нават знешне Багдановіч надае "Апокрыфу" форму традыцыйных евангельскіх тэкстаў, падзяляе яго на нумераваныя радочкі, ужывае рытміку арыгіналу, характэрныя формы звароту. Ен стварае цудоўную імітацыю. Каб так напісаць, трэба было не толькі мець талент і ведаць Евангелле, але і разумець, і адчуваць яго духам.

Вядома, у "Апокрыфу" Багдановіч выказаў сваё эстэтычнае крэда, свае адносіны да прыгажосці. Але ў словах "**нашто каласы, калі няма васількоў**" гаворыцца аб большым - **аб духоўнасці**, бо "*не хлебам адным будзе жыць чалавек,а ўсякім словам, якое зыходзіць з вуснаў Божых*" (Мф. 4, 4). Па хрысціянскаму разуменню Бог - гэта Любоў, Дабро, Прыгажосць, Творца і Мастак сусвету. Аб гэтым пісаў у IX стагоддзі святцель Іаан Златавусны, гэта і ў словах Ф.Дастаеўскага об тым, што "мир спасет красота". Гэтую вышэйшую прыгажосць і разумеў сэрцам паэт, бачыў яе ў слове Хрыста, слове Божым. У прастаце "Апокрыфа" - глыбокі багаслоўска-філасофскі сэнс, што характэрна і для першахрысціянскіх крыніц. "Апокрыф"глыбінна пераклікаецца з евангельскім апавяданнем аб Марфе і Марыі.

Максім Багдановіч шырока выкарыстоўваў біблейскія тэмы, матывы. Не выпадкова выбраў ён для перакладу апавяданне-апокрыф славацкага паэта Светазара Ваянскага "Юдава поле" аб страшным лёсе здрадніка Іуды, аб чорнай атрутнай крыві здрадніцтва. Пераклад уражвае сваёй пранікнёнасцю і вобразнасцю. Па матывах біблейскага сказання аб праведным Ною і сусветным патопе напісана паэма "Страцім-лебедзь", прыгажосць і філасофская глыбіня якой спалучаюцца з водарам народных сказанняў.

Гаворачы аб хрысціянскіх матывах, нельга не сказаць аб тэме, якая вылучае Багдановіча з іншых паэтаў. Гэта - тэма Божай Маці, тэма дзіўнага спалучэння дзявочай чысціні і ахвярнай прыгажосці мацярынства. Вышыня разумення паэтам гэтага фенамена надзвычайная. Як заўсёды просты зямны сюжэт спалучаецца ў ёй з глыбокай духоўнасцю. Славуты Рафаэль Санці ўсё сваё кароткае жыццё прысвяціў пошуку вобраза Мадонны. Горача рэлігійны, ён ніяк не мог перадаць свой задум. І вось аднойчы ноччу ён раптам убачыў на сцяне ззяў цудоўны вобраз Вечнадзевы Марыі. Ен знік, а мастак усё жыццё імкнуўся перадаць бачанае.

Багдановіч знайшоў прыгажосць дзявоцтва-мацярынства ў простым жыцці. Адкуль жа ў паэта такое бачанне і разуменне? Вядома, тут і прыродная назіральнасць, і тонкае эстэтычнае пачуццё, але галоўнае - чысціня сэрца паэта, яго высокія адносіны да жанчыны, што характэрна для хрысціянскай маралі, бо менавіта хрысціянства так высока ўзнесла дзявочую чысціню, самаахвярнасць маці, жаночую цнатлівасць. Па Евангеллю, Прыснадзева Марыя - гэта тая кветка чысціні і змірэння, якую чалавецтва прынесла Богу, каб прыняць у сябе Хрыста Збавіцеля. Услаўленне Божай Маці хлопчык Максім мог чуць з дзяцінства: у праваслаўных царкоўных спевах, у іконах, творах жывапісу. Душа хлопчыка прымала ў сябе высокае, чыстае, каб потым здолець убачыць яго ў жыцці, у вачах маленькай вясковай дзяўчынкі (верш " У вёсцы"), у дарагой сэрцу "Веранікe", у Мадонне славутага італьянскага мастака... Але духоўную прыгажосць здольна бачыць толькі чыс-

тае сэрца. Аб гэтым гаворыць Біблія: "*Блажени чистии сердцем, яко тии Бога узрят*" (Мф. 5, 8). Гэта вялікі дар - бачыць Бога ў вечнасці і Божае на зямлі, у другім чалавеку.

У апошнія гады жыцця Багдановіч, як і Пушкін, піша творы, у якіх найбольш яскрава адлюстраваліся яго хрысціянскія погляды, тэма Хрыста. Вось як апісваюцца прадсмяротныя, у дні перад Светлым Хрыстовым Уваскрэсеннем адбываючыяся, ўявы хворага хлопчыка Колькі ў аднайменным апавяданні:

*"Он увидел низко, низко над собою голубой купол с золотыми звездами. От этого купола ввысь тянулись золотые лучи - целые снопы золотых лучей. Лучи эти составляли длинный золотой путь. И путь этот вел в маленькую деревянную церковь, через царские врата, прямо в алтарь к образу Воскресения. По пути этому шел к нему, маленькому больному Кольке Тот самый светлый, лучезарный, на Которого он смотрел, когда причащался. Шел Он медленно... точно плыл по золотой поверхности. А кругом него сияние из ангелов, маленьких, легких, с крылышкми...И в руках у Него яйцо для него, для Кольки... И путь из золотых лучей ведет уже не в церковь, а куда-то в беспредельную высь, далеко, далеко. Там наверху, с распростертыми благословляющими руками стоит Тот... Кто шел к нему теперь в сонме ангелов и Кто под видом яйца принес ему вечность".*

Пад моцным уплывам біблейскага Экклезіяста і Евангелля напісана касмічная мініяцюра ў прозе "Калейдоскоп жизни". У ёй нікчэмнасць грахоўнай чалавечай мітусні, страшэнная кругаверць мёртвасці бязбожнага жыцця і адвечная міласэрнасць любові Хрыстовай:

*"Неумолимо быстро вертится и не знает отдыха круг жизни. Еле доступные глазу, мелькают дни, недели, месяцы, годы... Постепенно миняются на нем контуры, формы, краски, фигуры... Рождаются и исчезают бесследно целые поколения - людей, племен, народов... Меняются, расцветают, блекнут и - бесследно исчезают государства... Вьется пестрой лентой-змеей вечно изменчивая жизнь. Жадно, безумно хватаются за нее люди-дети. Хватаются и несутся, сами не зная, куда?.. зачем?..*

*И грезится людям-детям далекий чудный образ. Как немеркнущий свет забытого чистого прошлого... И встает перед ними ясный дивный образ. И обдает их лучезарным светом. И ласкает их тихим сиянием. Любовно-кротко смотрит на них из глубины тысячелетий этот мягкий свет всевидящих глаз, и звучит нечеловеческий голос - голос божественной правды:*

*- Да любите друг друга.*

*...А жизнь все тянется и зовет, все искрится и манит, и тонет в кровавых образах. И бурно рукоплещут ей люди-дети. А с высоты креста кротко глядит на них лик Искупителя. Низко склонилась опущенная глава Его. Ра́спростертые, пригвожденные руки стремятся как будто обхватить весь этот страшный, залитый кровью мир, обнять всех заблудших, растерянных, ищущих, в одном общем призыве к любви и всепрощению:*

*- Прости им, Отче, они не ведают, что творят".*

P.S.: Максім Багдановіч пахаваны на праваслаўных могілках у горадзе Ялце. Знойдзены запіс у кнізе Свята-Аляксандра-Неўскай царквы, што о менавіта ў ёй адбыўся чын яго пахавання.

У дзень 100-годдзя з дня нараджэння гэтага беларускага паэта у Менску, таксама у царкве святога благавернага вялікага князя Аляксандра Неўскага зноў гучала імя раба Божага Максіма за памінаннем на літургіі і паніхідзе.

В.ДЫШЫНЕВІЧ